# А. С. ПУШКІН І БЕЛАРУСЬ

**Мінск, 1999**

УДК 882.09+929 Пушкін: 882.6
ББК 83.3 (2 Рос−Рус)
П 91

Укладальнік

***Таццяна Махнач***

Рэдакцыйная калегія

*Наталля Давыдзенка* (рэдактар),

доктар філалагічных навук
*Адам Мальдзіс* (галоўны рэдактар),

дырэктар Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна
*Наталля Чуева*

Рэцэнзенты

доктар філасофскіх навук
*Уладзімір Конан*,

доктар філалагічных навук
*Вячаслаў Рагойша*

ISBN 985-08-0307-X

© Укладанне. Т. Махнач, 1999
© Прадмова. А. Мальдзіс, 1999

*Алена Ігнацюк*

# МАТЫВЫ "ПІКАВАЙ ДАМЫ" Ў АПОВЕСЦІ У. КАРАТКЕВІЧА "ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА"

Можна катэгарычна сцвярджаць, што творчасць А. С. Пушкіна мела значны ўплыў на Уладзіміра Караткевіча. Сведчаннем таму з'яўляецца той факт, што ў многія свае творы беларускі пісьменнік уключае цытаты з творчасці вялікага рускага пісьменніка, яго станоўчыя героі чытаюць творы аўтара "Яўгенія Анегіна". Ёсць спасылка на гэты раман і ў "Дзікім паляванні караля Стаха".

Паспрабуем правесці некаторыя паралелі паміж героямі А. С. Пушкіна і Уладзіміра Караткевіча. Пэўнае падабенства ёсць паміж Германам і Дубатоўкам. Хоць герой У. Караткевіча ў прамым сэнсе не ставіць сваё жыццё на карту "пікавай дамы", аднак ён, як і Герман, прагне хваравіта-вар'яцкай гульні. Дубатоўк стварае гульню ў "дзікае паляванне караля Стаха" і ад яе гіне. Аднак падобная паралель вобразаў (Дубатоўк—Герман) будзе незразумелай, калі мы не растлумачым сэнс паняцця "пікавай дамы" ў разглядаемых творах. Само ж "дзікае паляванне" ў аповесці У. Караткевіча ўспрымаецца намі не столькі як рэальнае дзеянне, створанае Дубатоўкам, хоць і яно ёсць, а хутчэй як легенда, у якой прысутнічае дух грандыёзнай маны, жорсткасці, славалюбства... Калі ж мы гаворым пра "пікавую даму" ў творы А. С. Пушкіна, нас прываблівае перш за ўсё, як і ў Караткевіча, ідэальна-містычны план вобраза, бо "пікавая дама" — гэта не проста гадальная карта, якая ўвасабляе сабою зло, а яшчэ і фея, пра якую так многа гавораць старадаўнія легенды. Яна з'яўляецца там, дзе памірае жыццё, спакушае смяротных сваім незвычайным хараством і лёгкім белым адзеннем. Такую фею можна ўбачыць толькі пад покрывам ночы. Калі ж фею захопіць світанак — прыгажосць знікае. Мы бачым перад сабой пачварную ведзьму. Заўважым, што ў аповесці А. С. Пушкіна "пікавая дама" ўяўляецца Герману пасля пахавання графіні ў вобразе добрай феі-карміліцы...

"Пікавая дама" — гэта ілюзія жыцця, прывід, мана. Яна ставіць герояў разглядаемых твораў на мяжу, што раз'ядноўвае і адначасова спалучае добрае і злое, прыгожае і пачварнае, зямное і нябеснае, магчымае і немагчымае ў рэальным жыцці. Назавём гэтую мяжу мяжой "пікавай дамы". У А. С. Пушкіна яна бачыцца адразу як гадальная карта, пакладзеная на жыццё. І як гэта часам бывае, нежывая гадальная карта выступае ў двух супрацьлеглых вобліках графіні*** "мала-

дой маскоўская Венеры” і адначасна ўродлівай старой. Графіня*** — жывая смерць, жывая гульня... На яе моліцца Герман, калі просіць грошай, і ў ёй памыляецца, бо яна (графіня-карта) нежывая.

Мяжа “пікавай дамы” ў аповесці Уладзіміра Караткевіча не ляжыць на паверхні твора, яе не адразу ўбачыш, а герой, што знаходзіцца на гэтай мяжы, вельмі ілюзорны. Гэта характэрна не толькі для Дубатоўка, але і Беларэцкага, які пры першай сустрэчы характарызуе апекуна Надзеі Яноўскай так: “Не вырадак, не вар’ят, які можа пайсці і на гераізм, і на злачынства. Добры просты волат. І як сакавіта, прыгожа гаворыць па-беларуску” [1]. Гэтая ацэнка не адпавядае рэчаіснасці, бо Дубатоўк не можа быць добрым. Не бывае зло добрым, хоць часам прымае выгляд дабра.

Матыў “пікавай дамы” ў аповесці У. Караткевіча дазваляе глыбей адчуць галоўную праблему твора, убачыць не толькі знешні бок гэтай праблемы: гістарычную повязь часоў (жыццё ў багацці і разнастайнасці праяў), але і ўнутраны: ілюзорнае жыццё, пазбаўленае сонца. Сонца не можа быць у Балотных Ялінах, дзе жыццё несапраўднае: “Тут багна і змрок. Тут ваўкі... У такія ночы мне здаецца, што нідзе, нідзе на зямлі няма сонца”, — прызнаецца Надзея Яноўская Беларэцкаму. Невыпадкова “пікавая дама” з’яўляецца там, дзе памірае жыццё ва ўсіх яго праявах. І на мяжы “пікавай дамы” кожны паводзіць сябе па-рознаму: адзін імкнецца выйсці за мяжу сваіх разумовых магчымасцей (Герман), другі — за мяжу пачуццёвых (Дубатоўк), а трэці — проста любіць жыццё, і “пікавай дамы” для яго не існуе, як не існуе злой дабрыні, пачварнай прыгажосці, дурнога розуму, старой маладосці (Беларэцкі).

*1994*

---

[1] Караткевіч У. Дзікае паляванне караля Стаха // Караткевіч У. Зб. тв.: У 8 т. Мн., 1990. Т. 7. С. 58.

## ЗМЕСТ

І наш Пушкін. *Адам Мальдзіс* ........ 5

## АРТЫКУЛЫ

### Беларусь у жыцці і творчасці А. С. Пушкіна

*Букчин Семен.* "...Народ, издревле нам родной" ........ 11
*Симанович Давид.* Подорожная Александра Пушкина: (Отрывок из книги) ..... 26
*Афанасьева З.* Па маршрутах паэта ........ 34
*Распопаў Аляксандр.* Сустрэча А. С. Пушкіна ў Магілёве 1824 г. ........ 35
*Воротникова Оксана.* Георгий Конисский. Православные реминисценции в творческой биографии А. С. Пушкина ........ 37
*Сцяпунін Ігар.* Няўлоўны Астроўскі ........ 40
*Селицкая Людмила.* Дубровский — шляхтич из-под Минска? ........ 50
*Селицкая Людмила.* Ужель тот самый — наш Дубровский? ........ 56
*Гучок Яўген.* Беларускі лёс Арыны Радзівонаўны ........ 66
*Мельнікаў Міхаіл.* Пушкін пра наш край ........ 71
*Рогалеў Аляксандр.* Пушкін і Паскевіч: эпізоды з біяграфіі двух знакамітых людзей ........ 73
*Сцяпунін Ігар.* Бескарыслівы паклоннік Пушкіна ........ 76
*Ратгаўз Сямён.* Шэсцьдзесят два радкі Пушкіна ........ 81
*Пушкін Ігар.* Пушкіны. Адкуль яны? ........ 85
*Лиокумович Тимофей.* Потомки Пушкина в Белоруссии ........ 87
*Шаров Анатолий.* Генерал А. А. Пушкин служил в Новогрудке ........ 93
*Шчэрбач І.* З Пушкінскага роду ........ 95
*Таранда Александр.* Правнуки Пушкина в Бобруйске. Судьба беспризорных .. 96
*Палясоўшчык Юрась.* Нашчадкі Пушкіна на рудабельскай зямлі ........ 99
*Мороз Викентий.* Потомков Пушкина следы... ........ 100
*Чигир Георгий.* По ком молчит колокол в Телуше... ........ 102

### А. С. Пушкін у беларускай літаратуры і мастацтве

*Ляшук Вера.* А. С. Пушкін і Беларусь: (Да гісторыі пытання) ........ 108
*Ларчанка Міхась.* Пушкін і беларуская паэзія ........ 111
*Богданович Максим.* Две заметки о стихотворениях Пушкина ........ 125
*Бярозкін Рыгор.* Багдановіч і Пушкін ........ 128
*Каваленка Віктар В.* Некаторыя асаблівасці тыпалагічнай блізкасці ў творчасці Максіма Багдановіча і А. С. Пушкіна ........ 137
*Купала Янка.* Любімы паэт ........ 148
*Лиокумович Тимофей.* "Я люблю Пушкіна: ён — жывы барацьбіт за свабоду..." ........ 149
*Колас Якуб.* Сонца нашай паэзіі ........ 156
*Мушынскі Міхась.* "Друг человечества" (Якуб Колас піша пра Пушкіна) ........ 159
*Колас Якуб.* Пушкін і наша культура ........ 168

*Шалемава Антаніна*. Лірычныя адступленні і вобразы прыроды ў “Яўгеніі Анегіне” А. С. Пушкіна і “Новай зямлі” Я. Коласа ........ 172
*Лебедзеў Уладзімір*. “Больш гарнуўся да Пушкіна...”: А. С. Пушкін у жыцці і творчасці М. І. Гарэцкага ........ 178
*Ігнацюк Алена*. Матывы “Пікавай дамы” ў аповесці У. Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха” ........ 181
*Панчанка Пімен*. Невычэрпная крыніца ........ 183
*Барадулін Рыгор*. Прарок ........ 185
*Саламевич Янка*. “Нет, весь я не умру...”: Произведения А. С. Пушкина в переводах на белорусский ........ 187
*Куляшоў Аркадзь*. Работа над перакладам “Яўгенія Анегіна” ........ 214
*Шкраба Рыгор*. “Яўгеній Анегін” на беларускай мове ........ 221
*Лужанін Максім*. Пушкін гаворыць па-беларуску ........ 226
*Пагранoўскі Мікола*. Чакаем “верного свиданья”: Па слядах аднаго малюнка Валенція Ваньковіча ........ 229
*Мароз Дзмітрый*. Свет вобразаў Пушкіна ........ 232
*Мароз Дзмітрый*. Казка ў новым прачытанні ........ 236
*Чыжэўскі Леанід*. “Дапамажыце раскрыць тайну!” ........ 242
*Крэпак Барыс*. “Ёсць проста Пушкін...” ........ 244
*Няфёд Уладзімір*. Пушкін і тэатр ........ 246
*Бондарава Ефрасіння*. Час прачытання класікі: Героі А. С. Пушкіна на “Беларусьфільме” ........ 250

### Ушанаванне памяці паэта

*Сцяпунін Ігар*. Пушкінскі юбілей 1899 г. у Мінску ........ 255
*Шырма Рыгор*. Жыццё і смерць А. С. Пушкіна ........ 261
*Танк Максім*. Светач рускай паэзіі ........ 267
*Навуменка Іван*. Бессмяротны геній рускай літаратуры ........ 270
*Быкаў Васіль*. Выступленне на сходзе, прысвечаным 150-м угодкам з дня смерці А. Пушкіна ........ 275
*Черепица Валерий*. “Дай нам руку в непогоду...” ........ 278
*Кліменка Алена*. Мая Пушкініяна ........ 283
*Грахоўскі Сяргей*. Сустрэча з Лукамор’ем ........ 285
*Вярцінскі Анатоль*. У Пушкіна ........ 291
*Котов Владимир*. Неизвестный Пушкин? ........ 295
*Залесская Ольга*. Дорога к Пушкину ........ 297

## У ВЯНОК ПАЭТУ

### Я памятник себе воздвиг нерукотворный...

*Барадулін Рыгор*. “Узвысіў помнік я сабе нерукатворны...” ........ 303
*Зуёнак Васіль*. “Сабе я помнік сам узвёў нерукатворны...” ........ 304
*Танк Максім*. “Я помнік збудаваў сабе нерукатворны...” ........ 305

*Агняцвет Эдзі*. Пушкінскія крыніцы ........ 306
1. 6 жніўня 1824 года ........ 306
2. Арына Радзівонаўна ........ 307
3. Пушкінскія Горы. 1944 ........ 308
4. Самым маладым ........ 309
*Александровіч Андрэй*. Шлях выгнання: Памяці А. С. Пушкіна ........ 310
*Аўрамчык Мікола*. Балада аб вызваленым паэце ........ 312

*Барадулін Рыгор*. “У Пушкіна адносіны з царом...” ... 314
*Барадулін Рыгор*. Пушкін: Трыпціх
I. I туга напілася з шалома ... 315
II. Дарога Пушкіна ... 316
III. Гавана. Доўгія вейкі здзіўлення ... 317
*Бачыла Алесь*. Трыпціх памяці А. С. Пушкіна
Куля Дантэса ... 318
Неадпомшчаны боль ... 319
Пушкінская бярозка ... 319
*Бураўкін Генадзь*. У Міхайлаўскім ... 321
*Вялюгін Анатоль*. Пушкін у Беларусі ... 322
*Грахоўскі Сяргей*. Радня ... 324
*Дранько-Майсюк Леанід*. Пушкін ... 326
*Калачынскі Міхась*. Пушкін над Лучосай ... 328
*Кислик Наум*. Встреча с Пушкиным ... 330
*Коўтун Валянціна*. Ноч перад... ... 332
*Лойка Алег*. Пушкін у Міхайлаўскім ... 334
*Пашкоў Генадзь*. У Міхайлаўскім дождж ... 335
*Пестрак Піліп*. Пушкінская восень ... 336
*Симанович Давид*. Тропою Пушкина
Бильярдные шары ... 337
Трость ... 337
Перед дуэлью ... 338
“За годом год — и век на марше...” ... 339
*Танк Максім*. У доме А. С. Пушкіна ... 341
*Янішчыц Яўгенія*. У падарожную А. С. Пушкіну ... 342

## БІБЛІЯГРАФІЯ

**Творы А. С. Пушкіна, апублікаваныя ў арыгінале на тэрыторыі Беларусі і ў беларускіх крыніцах** ... 345
**Пераклады твораў А. С. Пушкіна** ... 348
На беларускую мову ... 348
На польскую мову ... 356
На яўрэйскую мову ... 356
**Кнігі пра А. С. Пушкіна** ... 357
На беларускай мове ... 357
На рускай мове ... 357
**Артыкулы пра А. С. Пушкіна і яго сувязі з Беларуссю** ... 358
На беларускай мове ... 358
На польскай мове ... 382
На рускай мове ... 382
На яўрэйскай мове ... 399
**А. С. Пушкін у літаратурных творах** ... 400
На беларускай мове ... 400
На польскай мове ... 406
На рускай мове ... 406
На ўкраінскай мове ... 409
На чувашскай мове ... 409
На яўрэйскай мове ... 409
**А. С. Пушкін у выяўленчым мастацтве** ... 409
Партрэты ... 409

Па пушкінскіх мясцінах ........ 410
Ілюстрацыі да твораў А. С. Пушкіна ........ 411
Эскізы дэкарацый і касцюмаў да тэатральных пастановак ........ 411
Фотаздымкі з тэатральных пастановак ........ 413
Скульптура ........ 414
**Нотныя запісы па творах А. С. Пушкіна** ........ 415
Творы беларускіх кампазітараў на словы А. С. Пушкіна ........ 415
Творы рускіх кампазітараў на словы А. С. Пушкіна, апублікаваныя ў Беларусі ........ 416
**Радыёзапісы па творах А. С. Пушкіна** ........ 417
Літаратурна-драматычныя гуказапісы на беларускай і рускай мовах ........ 417
Музычныя гуказапісы ........ 417
ДАДАТАК
**А. С. Пушкін і тэатральнае мастацтва Беларусі** ........ 419
Драматычны тэатр ........ 419
Лялечны тэатр ........ 420
Музычны тэатр ........ 421
Опера ........ 421
Балет ........ 422
Цыркавыя прадстаўленні, тэлевізійныя і кінематаграфічныя пастаноўкі ........ 422